# ГАРАДЗІШЧА ПЕРЫЯДУ РАННЯГА ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. ПРЫЛЕПЫ)

**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь):** 613В000585

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Прылепы

**Апісанне:**

Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку каля в. Прылепы Смалявіцкага раёна – помнік археалогіі (**613В000585**). Помнік выяўлен ў 1925 г., у 1964, 1979, 1997, 2003 г. яго абследававалі.

Былі знаходкі, якія складаюць абломкі глінянага ляпнога посуду.

Самай выдатнай знаходкай з'яўляецца жалезная фібула сярэднелаценскай схемы з трохкутна пашыраным канцом ножкі, які змацаваны са спінкай двума "лапкамі". Галоўка з іголкай абламаны. Вышыня корпуса 8,5 см, дліна тонкай круглай (дыяметр 2 мм) у перасеку ножкі 3,3 см. Амаль пасярэдзіне тонкай часткі ножкі прымацавана бронзавае сплясканае кольца з заходзячымі канцамі (шырына пласціны 5 мм, таўшчынёй 1 мм). Аналагі знойдзены на зарубенецкіх могільніках Велемічы 1,2 і Чаплін.

Найбольш шматлікую групу знаходак складаюць абломкі глінянага ляпнога посуду. Выдзелена гладкасценная (65%), штрыхаваная (34,5%) і падлошчаная (0,5%) кераміка.

Сустрэўся посуд (гладкасценны і са штрыхоўкай), у цеста якой разам з дробнай (1 – 2 мм) і сярэдняй (3 – 4 мм) жарствой у вялікай колькасці дабаўлялася буйная жарства (5 – 6 мм). Такія абломкі далікатныя і моцна крышацца. Падобнае глінянае цеста адзначана А.М.Мядведзевым на іншам селішчы. Для падлошчанай керамікі фармовачная маса вельмі старанна вымешвалася. Памер штучных дабавак (у асноўным пясок) у гліне не пераважаў 0,5 – 1,0 мм.

Знойдзена 14 фрагментаў прыдонных частак (гладкасценныя і штрыхаваныя), па якім можна прасачыць тэхніку лепкі з прымяненнем ёмістнага начыну. Абломкі днішчаў сведчаць аб тым, што посуд у Прылепах пласкадонны. У асноўным прыдонная частка злучалася з дном пад пэўным вуглом, сустракаюца днішчы з "пяткай", ёсць тры фрагменты з плаўным (закругленным) пераходам ніжняй часткі тулава у днішчы.

У Прылепах знойдзены два фрагменты посуду (гладкасценны і падлашчоны) з акруглай формай тулава і пяць з круглявым рубам. Знойдзены таксама некалькі фрагментаў рабрыстых гаршкоў з прамымі нахіленымі ўнутр венцам і шыйкай. Рабрыстыя формы шырока вядомы на ўсёй тэрыторыі

распаўсюджвання культуры штрыхованай керамікі з апошняй чвэрці 1 тыс. н. э. і да 3 – 4 стст. н. э.

Частка посуду ў Прылепах упрыгожана. Элементамі арнамента галоўным чынам служылі пальцавыя зашчыпы, зрэдку ямачныя ўціскі і тычкі палачкай.

З гліны выраблялі прасліца. Пяць маюць круглявую паверхню, адно біканічнае. Найбольшы дыяметр вырабу ад 22 да 40 мм, дыяметр адтуліны 10 – 13 мм, вышыня 11 – 18 мм. Адно прасліца арнаментавана па бакавой паверхні кропкавымі наколамі, размешчанымі ў выглядзе трохвугольнікаў. Судзячы па памерах і вялікаму дыяметру каналаў, дадзеныя прадметы былі выраблены ў познюю пару бытавання селішча.

У культурным слоі знойдзены 560 абломкаў глінянай абмазкі, якой запаўняліся пазы паміж бярвёнамі пры будаўніцтве жылля.

Адбіткі дрэва добра прыкметныя на многіх кусках гліны трохвугольнай і прамавугольнай формы. Абмазку знаходзілі ва ўсёй тоўшчы перагною, месцы навалы яе прасачыць не атрымалася.

У гаспадарчых ямах знойдзены абломкі ляпной керамікі (гладкасценнай з штрыхаванай паверхняй), косці жывёл і гліняная абмазка.

Такім чынам, вывучыўшы знойдзеныя на гарадзішчы Прылепы прадметы матэрыяльнай культуры, можна гаварыць аб тым, што дадзеная тэрыторыя была заселена з 2 ст. да н. э. па 4 ст. н. э. носьбітамі культуры штрыхаванай керамікі.